у Саюзе пісьменнікаў Беларусі

# Майстру слова

**28 кастрычніка ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбыўся юбілейны творчы вечар майстра мастацкага слова Мікалая Чаргінца. Разам са шматлікімі чытачамі і прыхільнікамі магутнага пісьменніцкага таленту ад імя калектыву і Савета аддзялення Гомельскага абласнога аддзялення СПБ, а таксама па даручэнні партнёрскіх пісьменніцкіх і грамадскіх арганізацый абласнога аддзялення з блізкага замежжа вядомага беларускага празаіка, ганаровага старшыню Саюза пісьменнікаў Беларусі, народнага пісьменніка Беларусі Мікалая Чаргінца са слаўным 85-годдзем павіншаваў старшыня абласнога аддзялення СПБ Уладзімір Гаўрыловіч.**

Уладзімір Мікалаевіч шчыра падзякаваў Мікалаю Чаргінцу не толькі за яго вялікую творчую працу, але і за плённую шматгадовую сумесную дзейнасць па папулярызацыі кнігі і чытання ў грамадстве.

Асаблівая падзяка прагучала за падтрымку шэрагу міжнародных праектаў, ініцыіраваных і ажыццёўленых абласным аддзяленнем СПБ, а таксама міжнародных і абласных фестываляў, якія амаль за два дзесяцігоддзі сталі брэндам Гомельшчыны і краіны, — «Славянскія літаратурныя Дажынкі» і «На зямлі Кірылы Тураўскага».

Дарэчы, адным з яркіх праектаў апошняга дзесяцігоддзя стаў беларуска-рускі фестываль-конкурс перакладаў «Берагі дружбы», які з першага дня заснавання падтрымліваецца Мікалаем Чаргінцом. Першы поўны камплект з дзвюх кніг «Зямля — наш агульны дом» па даручэнні ўсіх арганізатараў і ўдзельнікаў міжнароднага праекта Уладзімір Гаўрыловіч урачыста ўручыў ганароваму старшыні СПБ, сустаршыні Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы ў яго 85-гадовы юбілей. А ад імя Міжнароднага саюза пісьменнікаў і майстроў мастацтваў народнаму пісьменніку краіны ўручаны юбілейны медаль «Берагі дружбы — 10 гадоў творчага развіцця».

У. Гаўрыловіч таксама перадаў Мікалаю Іванавічу шматлікія прывітанні ад гомельскіх, а таксама расійскіх калег і партнёраў (Міжнароднага саюза пісьменнікаў і майстроў мастацтваў, Краснадарскай краявой, Бранскай, Калужскай, Смаленскай, Курскай абласных арганізацый Саюза пісьменнікаў Расіі, мясцовых нацыянальна-культурных аўтаномій Расіі «Беларусы Няклінаўскага раёна», «Беларусы Растоўскай вобласці» і інш.), пажадаў народнаму пісьменніку здароўя, бадзёрасці духу, непагаснага імкнення годна прадстаўляць нашу нацыянальную літаратуру на сусветным узроўні, ажыццяўлення новых творчых задум.

**Мікалай УЛАДЗІМІРАЎ**